ПЛЕЯДА МАЛАДЫХ

Кірыл ХАЛЕЦКІ:

# «МОЙ ДЭБЮТ АДКРЫЕ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ ІНШЫХ МАЛАДЫХ КІНЕМАТАГРАФІСТАЎ»



**Нягледзячы на юны ўзрост, ён з'яўляецца аўтарам двух фільмаў, якія зняў за ўласныя сродкі яшчэ падчас вучобы ў Беларускай акадэміі мастацтваў. Малады чалавек звярнуў на сябе ўвагу спецыялістаў і быў адзначаны прэзідэнцкай стыпендыяй. Атрымаў размеркаванне на «Беларусьфільм», дзе была створана студыя маладзёжнага кіно «Смолка». Але можна доўга хадзіць у статусе рэжысёра, які «падае надзеі», без магчымасці зняць поўнаметражную карціну. А ў Кірыла такая магчымасць з'явілася ўжо праз паўгода работы на студыі: прайшоўшы праз конкурс сцэнарыяў, арганізаваны Міністэрствам культуры, ён атрымаў права на поўнаметражны дэбют. Работа над фільмам «Кіношнікі» ідзе поўным ходам. Ідэя фільма, які павінен быць зняты ў жанры камедыі, заключаецца ў тым, каб паказаць той бок існавання кінаіндустрыі, што заўсёды застаецца для гледача «за кадрам». А галоўны герой карціны — малады чалавек, які марыць здымаць кіно... З рэжысёрам «Кіношнікаў» — наша размова пра мары і іх увасабленне ў рэальнасць.**

***— Вы здымалі кіно, калі вучыліся ў Акадэміі мастацтваў. Наколькі важная для маладога рэжысёра школа? Бо ёсць у свеце такія гісторыі, калі чалавек вырашыў: «Хачу здымаць кіно», — і стаў яго здымаць...***

— Гэта, напэўна, праблема сучаснай моладзі, для якой вызначыцца з будучай прафесіяй не так проста: некаторыя пра яе не думаюць ажно да заканчэння школы, што не вельмі добра. Чалавек не ведае, куды пайсці вучыцца далей, і выбар навучальнай установы, куды ён паступае, вызначае прахадны бал. А потым аказваецца, што гэта зусім не тое, чым ён хацеў бы займацца ўсё жыццё. Страта часу. Яшчэ з дзяцінства я разумеў, што мне хочацца займацца творчасцю. У мяне было некалькі стадый усведамлення гэтага. Спачатку хацеў быць клоўнам, потым зразумеў, што цікава быць акцёрам. Займаўся ў кінашколе акцёрскай падрыхтоўкай. А недзе ў класе дзявятым пераключыўся на рэжысуру, бо зразумеў, што акцёр з мяне так сабе, а вось за кадрам мне падабаецца значна больш: думаць, як нешта зрабіць, што трэба, каб атрымалася лепш і цікавей. І яшчэ ёсць работа над сцэнарыем — важны момант, які мяне вельмі захапляе.

Але я не ведаў, куды пайсці з такімі жаданнямі. Таму хачу сказаць дзякуй свайму бацьку, які адправіў мяне на падрыхтоўчыя курсы па рэжысуры пры Беларускай акадэміі мастацтваў, дзе займаўся два гады. Праграма разлічаная на адзін год, але я хадзіў увесь 10-ы клас і ўвесь 11-ы: на выпадак, калі раптам у 10-м зразумею, што гэта не маё, трэба пакінуць магчымасць падумаць. Але я яшчэ больш упэўніўся ў рашэнні, што менавіта гэта мне патрэбна.

***— На тым этапе ўсе звычайна думаюць: галоўнае — паступіць, а там як пойдзе...***

— Самае галоўнае, што робіць Акадэмія мастацтваў, — ломіць тваё чаканні, пагружае ў рэальнасць. Калі паступалі, мы ўсе былі Таранціна, Спілбергі, Таркоўскія. Ахвотна разважалі пра мастацтва, пра рэжысуру. Але ўжо першы семестр паказвае, хто ёсць хто. Калі прымаеш рэальнасць, дзе ты асабліва не патрэбны, а твае погляды не надта арыгінальныя ў параўнанні з поглядамі іншых людзей, але ўсё роўна ты поўны рашучасці існаваць у тым свеце, тады ёсць шанц. Многія «зліваюцца» на дадзеным этапе. Гэта значыць, людзі адчуваюць, што іх не разумеюць, што ўсё складана, — ім становіцца не цікава. Многія ўсё ж заканчваюць акадэмію, але ў выніку не становяцца рэжысёрамі.

***— У каго з выкладчыкаў лепш за ўсё атрымалася «зазямліць» вашы мары?***

— Майстар курса Валерый Міхайлавіч Гаравы практычна адразу даў зразумець, што не маюць ніякага значэння нашы жаданні і напрацоўкі, якія мы мелі да сваіх 17-18 гадоў. Калісьці пры паступленні ва Усерасійскі дзяржаўны ўніверсітэт кінематаграфіі, напрыклад, аддавалі перавагу людзям з жыццёвым досведам, з нейкай сваёй філасофіяй. Цяпер усё спрасцілася. Атрымліваецца: школа скончылася, трэба паступаць, а які ў цябе жыццёвы набытак? Першае каханне, нейкія падлеткавыя перажыванні. І ты пра гэта хочаш здымаць кіно?.. Нашаму майстру курса на той момант быў 71 год, дасведчаны рэжысёр, 45 гадоў адпрацаваў на беларускім тэлебачанні, зняў шмат дакументальных перадач. Таму ён пачаў нас, скажам так, «ламаць». Гэта важны момант, таму што мы паступалі на спецыяльнасць «рэжысёр кіно і тэлебачання». Але нам адразу сказалі, што беларускае кіно перажывае складаны этап свайго развіцця, таму ў нас ёсць перспектыва працаваць на тэлебачанні. Але «метадычкі», як працаваць для кіно і тэлебачання, адны і тыя ж. Толькі тэлебачанне ў большай ступені мае на ўвазе актуальнасць, там цэніцца дакументальнасць. А кіно ўсё ж такі — пра творчасць.

У вольны ад заняткаў час я дадаткова для сябе вывучаў літаратуру па кіно, па напісанні сцэнарыяў. Глядзеў шмат фільмаў — гэта, напэўна, важны варыянт вучобы, калі сам аналізуеш кіно: як яно зроблена, як працуе? Калі выходзіш з акадэміі і не ўмееш думаць, тады, хутчэй за ўсё, ты не на тую «вуліцу» прыйшоў. Бо нават пры вывучэнні работы рэжысёраў тэлебачання студэнты робяць курсавыя работы, сярод якіх кліп, рэпартаж, замалёўка, дакументальны фільм і кароткаметражны. Выніковы — дыпломны праект — на выбар аўтара. Можна яго спецыяльна зняць, а можна выбраць найлепшую работу за час вучобы. Усё ідзе ад самога чалавека. Можна і чыста дзеля «птушачкі» адвучыцца, але ў чым тады сэнс?

***— Пра што быў ваш дыпломны фільм?***

— Я абараняў дыплом фільмам «Дарога». Зняў яго пасля другога курса ўлетку 2021 года як фестывальнае кіно. Гэта быў дэбютны кароткаметражны фільм. У акадэміі мастацтваў стужка вельмі спадабалася. Яна «прайшлася» па буйных фестывалях, я атрымаў шмат водгукаў. А сёння студэнты акадэміі мастацтваў разбіраюць «Дарогу» на ўроках па мантажы. Мабыць, у прастаце гэтай стужкі ёсць адметнасць — фільм жа зроблены без слоў, гісторыя даволі зразумелая. Але гледачы могуць па-свойму фармуляваць яе сэнсы. Аднойчы я зрабіў няправільна, гэта было на фестывалі Moscow Shorts. Зала на тысячу месцаў была цалкам запоўненая, я выйшаў на сцэну, і мяне папрасілі растлумачыць, пра што кіно. Дарма я так зрабіў! Бо да гэтага моманту кожны з тысячы гледачоў думаў па-свойму. А я растлумачыў — і людзі аўтаматычна забылі той сэнс, які ўбачылі яны самі. Не варта тлумачыць сваё кіно: а раптам гледачы трактуюць інакш? Бо я закладваў больш простыя сэнсы, чым тыя, што потым агучылі людзі. Калі мне расказваюць маё кіно, часта атрымліваю шок: няўжо я такое прыдумаў?

***— А якія фільмы вы глядзелі, каго з рэжысёраў выдзялялі для сябе?***

— Тут, напэўна, як з літаратурай. Калі ў школе нас прымушаюць нешта чытаць, нам не надта падабаецца. Напрыклад, трэба прачытаць «Вайну і мір», чатыры тамы. Падлетку хочацца пагуляць, а ён павінен адужваць грандыёзны раман — з якім пачуццём ён будзе яго чытаць?.. Але з узростам сам прыходзіш да таго, каб прачытаць, таму што гэта цікава. Гэтаксама і з фільмамі. Спачатку ў акадэміі нам настойліва раілі, што абавязкова трэба паглядзець, — і не было ніякага задавальнення. А потым, калі сам разумееш і адчуваеш патрэбу, становіцца цікава. Напрыклад, я дасюль не глядзеў «Іронію лёсу», лічу, што мне рана глядзець гэты фільм, магу яго яшчэ не зразумець. Але сам для сябе ў нейкі момант пачаў вывучаць творчасць Таркоўскага, Феліні. Выпадкова натрапіў на фільмы Рабэра Брэсона, французскага кінарэжысёра. Мне падаецца, што сустрэча з імі стала для мяне ключавой. Я захапіўся яго творчасцю, стараўся зразумець яго філасофію, яна мне аказалася блізкай. Гэта якраз і адбілася на кароткаметражным фільме «Дарога». Але цяпер я разумею, што трэба больш глядзець у бок таго, што зразумела беларусам. Еўрапейская культура кіно — класная. Але нашаму (ды і расійскаму) гледачу яна можа быць не зусім блізкая. Таму стараюся цяпер больш глядзець рускае кіно — сучасныя, актуальныя фільмы, дэбюты маладых кінематаграфістаў.

Важны момант, які датычыўся старту работы над фільмам, адкрыла мне лекцыя маскоўскага прадзюсара Аляксея Пятрухіна. Ён сказаў, што спачатку трэба вызначыць: мы робім мастацтва ці бізнес. Калі мы робім мастацтва, то ўсё павінна быць проста «вау!». Але трэба разумець, што прадаць гэта будзе складана. А калі мы робім бізнес, то сцэнарый павінен быць больш просты, патрэбная пара-тройка суперакцёраў — і тады мы спакойна прадаём карціну.

Напэўна, дэбютны поўнаметражны фільм павінен у першую чаргу ісці знутры: што б мне хацелася паказаць? Трэба заявіць пра сябе ў кінасвеце. Так, ёсць выключэнні, напрыклад, Квенцін Таранціна — чалавек, які наогул не меў дачынення да кіно і раптам пачаў здымаць. Ён пачынаў рабіць не бізнес, а мастацтва, і пасля яно спадабалася людзям. Вось таму я для сябе ўмоўна вызначыў: пяць фільмаў трэба рабіць для гледачоў, а адзін для сябе.

***— Вы аптымістычна глядзіце ў будучыню. Таму што вось з'явіўся шанц зняць кіно, але як пойдзе далей — незразумела...***

— Так, гэта як рулетка. Нават падчас здымак «Кіношнікаў» ужо пачаліся размовы: а што я буду рабіць далей? Якія сцэнарыі ў мяне ёсць яшчэ? Як я разумею, мой дэбют адкрые магчымасці для іншых маладых кінематаграфістаў. Таму вельмі вялікія стаўкі на фільм «Кіношнікі». Калі мы пакажам, што маладыя могуць рабіць добрае кіно, здымаць дэбютныя фільмы стане прасцей. Калі ж маладыя правалядца, наступны дэбют можа здарыцца няхутка. Таму мой фільм — своеасаблівы партал для выхаду да гледача маладых кінематаграфістаў. Мусіць, да стварэння студыі маладзёжнага кіно на «Беларусьфільме» да маладых ставіліся скептычна, а цяпер ёсць магчымасць зразумець, што яны могуць рабіць кіно. Я настойваю на тым, што досвед і маладосць разам даюць добры вынік.

***— Якія суадносіны вопыту і маладосці ў вашай здымачнай групе?***

— За адміністрацыйныя пытанні і больш глабальныя (як мастацкая частка) адказваюць дасведчаныя спецыялісты. А што да творчасці і палёту думкі — гэта ў большай ступені зона адказнасці маладых.

Выніковы сцэнарый склаўся дзякуючы нашаму супрацоўніцтву са сцэнарыстам з Масквы Канстанцінам Бакуніным, які ўжо меў досвед работы над фільмамі. Мне хацелася, каб каманда, якая ўдзельнічае ў здымках, была маладой, мела агульны погляд — сучасны, актуальны. Наш аператар Уладзімір Казіятка сёлета скончыў Усерасійскі дзяржаўны ўніверсітэт кінематаграфіі — для яго гэта таксама дэбют. Ёсць і іншыя спецыялісты, якія дэбютуюць у мастацкім кіно. Напрыклад, гукарэжысёр Настасся Панасевіч, выпускніца Беларускай акадэміі мастацтваў. Музыку да фільма таксама напісалі маладыя хлопцы. Ёсць у нас людзі з багатым прафесійным багажом, як мастак-пастаноўшчык Ігар Хруцкі. У нас маладосць і вопыт спалучыліся арганічна.



***— Ці змяніліся вашы ўяўленні пра прафесію пасля таго, як прайшлі здымкі?***

— Я зразумеў, што быць рэжысёрам — гэта лад жыцця, лад мыслення, і так сем дзён на тыдзень. Напрыклад, я спачатку думаў, што буду здымаць у будні, а ў выхадныя — адпачываць. Нічога падобнага! У выхадныя ў мяне ідзе іншая работа — аналізую тое, што мы наздымалі ў будні. Думаю, як гэта манціраваць, што будзем здымаць далей. Нехта лічыць, што гэта ж не рукамі працаваць, а галавой. Але наогул інтэлектуальная праца не проста так шануецца больш, чым фізічная. Праўда, часам хочацца выключыць галаву і крыху папрацаваць рукамі. Для гэтага ёсць дача, агароды.

***— Цяжка ўявіць. Звычайна маладых людзей складана выцягнуць на агароды...***

— Вядома, што на студыі я рэжысёр, а дома — сын і ўнук, ад якога чакаюць дапамогі. Але ў сям'і мяне вельмі падтрымліваюць: блізкім цікава тое, чым я займаюся. І што мяне ўразіла: як толькі сын стаў рэжысёрам, усе родныя адразу ж гатовыя пайсці ў акцёры! Некалькі разоў я нават паспрабаваў, але ўсё ж аддаю перавагу прафесіяналам.

***— Многія рэжысёры робяць «фішку» з таго, што здымаць непрафесійных акцёраў.***

— Гэта, напэўна, больш датычыцца аўтарскага кіно — там любяць, каб было бліжэй да жыцця. «Дарога» — практычна нямое кіно, мне было няважна, як мае акцёры размаўлялі, я ўлічваў у асноўным вонкавыя даныя, а для гэтага дастаткова было фатаграфій. Але для здымак у поўнаметражным кіно трэба ўлічваць шмат фактараў: і знешнасць, і харызму. У нейкіх момантах пры выбары акцёраў для фільма «Кіношнікі» мы траплялі ў вобраз на сто працэнтаў. А кагосьці выпрабоўвалі вельмі доўга, аж да здымак. Ёсць такое паняцце як «патрапіць у героя».

***— Да нядаўняга часу ў беларускім кіно імкнуліся здымаць расійскіх зорак, каб прыцягнуць больш шырокую глядацкую аўдыторыю. Вам даводзілася пра тое думаць?***

— Гэта тое, з чаго мы пачыналі. Таму што думалі пра магчымасць выйсці на больш шырокі рынак, што дазволіла б фільму ахапіць значна большую аўдыторыю. Удзел вядомых акцёраў, адпаведна, уплывае на рэйтынгі фільма і продажы. Мяне спрабавалі пераканаць, што гэта не мае значэння, галоўнае — сама гісторыя. Але пачынаю разважаць як глядач: калі ёсць вядомая асоба ў трэйлеры — то, хутчэй за ўсё, я пагляджу фільм. А калі глядач нікога з акцёраў не ведае, яму ўжо не так цікава. Таму ў нас было жаданне прыцягнуць расійскіх артыстаў. Мяне падкупіла, што нават знакамітым акцёрам вельмі спадабаўся наш сцэнарый. Праўда, з-за розных абставін альбо сцэнарый мяняўся (ажно 12 разоў), альбо гісторыя мянялася, альбо ўзнікалі іншыя прычыны, і на нейкіх этапах нам даводзілася мяняць акцёраў. У канчатковым варыянце мы вырашылі сабраць беларускі акцёрскі састаў, але з галоўнай зоркай нашага фільма — Юрыем Стаянавым. Я адразу казаў, што вяршыцеля лёсу нашага галоўнага героя павінен іграць вельмі вядомы акцёр, які мае вагу ў свеце кіно. Ён жа вырашыць і лёс нашага фільма. Спачатку мы разглядалі на гэтую ролю Фёдара Бандарчука, потым думалі пра Андрэя Мярзлікіна альбо пра Юрыя Калакольнікава. Але спыніліся на Стаянаве. З Юрыем Мікалаевічам усё знялі проста класна. У нашым фільме ён іграе самога сябе. Мне вельмі спадабалася, што ён не іграў камедыю, а паказаў праўду жыцця і нейкі ўнутраны боль — ён з'яўляецца ў кульмінацыі фільма як настаўнік, які вызначае далейшы шлях героя.

***— Якой бачыцца аўдыторыя фільма?***

— Мы нацэленыя на шырокую аўдыторыю. Нават на этапе напісання сцэнарыя я думаў над тым, якая будзе стратэгія прасоўвання стужкі, таму што сёння шмат залежыць ад рэкламы. Мала таго, што трэба зняць фільм, яго яшчэ неабходна правільна прэзентаваць гледачу. Мне падалося, узроставае абмежаванне «12+», а таксама жанр — летняя сямейная камедыя — могуць зацікавіць больш шырокую аўдыторыю. Сама тэма — фільм пра кіно, пра тое, што адбываецца «за кадрам», на мой погляд, можа выклікаць цікавасць. Так, у нас узнімаюцца актуальныя маладзёжныя тэмы, такія як штучны інтэлект, сацыяльныя сеткі. А таксама ёсць тэмы, якія будуць зразумелыя больш даросламу гледачу: мы даём адсылкі да сусветнай класікі, некалькі персанажаў прадстаўляе старую «кіношную» школу. Падчас здымак агульны настрой групы быў лёгкі, вясёлы і радасны. Я спадзяюся, што гэта ўсё адаб'ецца і на канчатковым варыянце карціны. Некаторыя кажуць, што калі смешна падчас здымак камедыі, то потым гледачу будзе не смешна. Не ведаю, з чым тое звязана. Але мы на пляцоўцы ўвесь час нешта дадумвалі. Я даў акцёрам поўную свабоду, прасіў, хай калі яны прыдумаюць нешта цікавае, то абавязкова мне пра гэта скажуць, і мы разам абмяркуем. Калі ідэя ўпісвалася ў кантэкст персанажа ці сцэны, мы яе выкарыстоўвалі. Такіх момантаў было шмат. Гумар нараджаўся на пляцоўцы. Ужо падчас здымак я зразумеў: адзін фільм закладваецца ў сцэнарый, на здымках атрымліваецца іншы, а падчас мантажу я, хутчэй за ўсё, буду зноў нешта мяняць. Як казаў Таркоўскі: калі хоць бы частку першапачатковай задумы ўдаецца рэалізаваць у фільме, — гэта вялікі поспех. Бо заўсёды ёсць нейкія папраўкі: з-за надвор'я, па лакацыях, па касцюмах, па акцёрах...

***— Калі вы прайшлі праз конкурс, то здымкі павінны быць цалкам забяспечаныя фінансава. Але ці можна пралічыць усё наперад?***

— Калі толькі пішацца сцэнарый, ідзе палёт фантазіі, не думаеш пра нешта матэрыяльнае. У мяне як у маладога рэжысёра не было разумення, колькі гэта каштуе. І калі да нас далучылася больш дасведчаная частка групы, мы пачалі лічыць фінансы. Падавалі праект з разлікам на пэўную суму, але потым аказалася, што для поўнага ўвасаблення дадзенага сцэнарыя патрэбная сума крыху большая. Пачаліся спрашчэнні і кампрамісы. Магу прыадкрыць сакрэт: паводле першапачатковай версіі дзеянне павінна было адбывацца ў аграгарадку, набываючы флёр вясковай камедыі, што магло б надаць карціне пэўны шарм. Але я вырашыў ад гэтага адмовіцца і задумаўся: а чаму б не зрабіць усё на кінастудыі? Мы паказалі многія цэхі і сістэмы «Беларусьфільма». Гэта ж цікава: паказваем кіно знутры. Мяне ўразіла, што ў маі-чэрвені на кінастудыі праходзіць шмат экскурсій і для дзяцей, і для больш дарослай аўдыторыі. Значыць, людзям падабаецца. Для супрацоўнікаў тут усё звычайнае, бо мы тут кожны дзень. Спачатку з аператарам нават задумваліся: а што тут можна здымаць? А падчас работы зразумелі, што ўсё можна паказаць прыгожа. Выбіралі самыя ўдалыя лакацыі кінастудыі, каб надаць «Кіношнікам» пераканаўчасці. Бо гэта не дакументальны фільм, усё імкнёмся рабіць па-мастацку.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

*Аўдыяверсія праекта — на радыё Пілот-FM і на сайце zviazda.by.*

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*